способствовать развитию творческих навыков, необходимых инструменталистам при игре сольных каденций, дирижерам – при выполнении оркестровок. Кроме того, подобные задания повысят интерес студентов-духовиков к занятиям в классе фортепиано.

УДК 069.015

***Б. А. Лазука,***
*кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт, загадчык аддзела старажытнабеларускай культуры дзяржаўнай навуковай установы «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі»*

## МУЗЕЙНЫЯ ПРАКТЫКІ Ў СІСТЭМЕ ФАРМІРАВАННЯ ПРАФЕСІЙНЫХ КАМПЕТЭНЦЫЙ СТУДЭНТАЎ ТВОРЧЫХ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЕЙ

**Анатацыя.** Разглядаюцца актуальныя пытанні арганізацыі і правядзення практык ва ўмовах музейных устаноў, іх роля ў адукацыйным і выхаваўчым працэсе, у фарміраванні прафесійных і маральных якасцей творчай асобы.

**Ключавыя словы:** музей, практыкі, кампетэнцыі, творчыя спецыяльнасці.

***B. Lazuka,***
*PhD in Art History, Associate Professor, Head of the Department of Ancient Belarusian Cultureof the Center for Research of Belarusian Culture, Language and Literature of the National Academy of Sciences of Belarus*

## MUSEUM PRACTICES IN THE SYSTEM OF FORMATION OF PROFESSIONAL COMPETENCIES OF STUDENTS OF CREATIVE SPECIALTIES

**Abstract.** The article considers the topical issues of organizing and conducting internships in museum institutions, their role in the educational process, in the formation of professional and moral qualities of a creative personality.

**Keywords:** museum, practices, competencies, creative specialties.

У сучасных умовах развіцця айчыннай вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі музейныя практыкі, як правіла, акрэслі-

ваюцца двума кірункамі – адукацыйным і выхаваўча-асветніцкім. У кантэксце разглядаемых пытанняў гэта палажэнне грунтуецца на асноўных задачах дзейнасці музеяў у сферы адукацыі і выхавання, якія можна вызначыць як наступныя: развіццё здольнасцей асобы атрымліваць і засвойваць інфармацыю з першакрыніц, фарміраванне паняційнага апарату на аснове назірання і аналізу музейных прадметаў, удасканальванне навыкаў самастойнага навучання, матывацыя вучэбнага працэсу, накіраванага на фарміраванне прафесійных кампетэнцый, задавальненне і карэкціроўка пазнавальных, культурных і эстэтычных запатрабаванняў асобы [1, с. 83–86].

Музейныя практыкі па сваіх задачах, формах, часавых межах рэгламентуюцца вучэбнымі планамі і вучэбнымі праграмамі канкрэтных дысцыплін, якія вывучаюцца ва ўстановах вышэйшай адукацыі ці сярэдніх спецыяльных навучальных установах (далей УВА, ССНУ). Да гэтай умовы варта дадаць неабходнасць уліку асаблівай спецыфікі творчых спецыяльнасцей. Тэзіс аб тым, што працэс навучання студэнтаў, якія прыходзяць у музей на практыку, пачынаецца нібыта з «чыстага ліста», будзе непрымальным. Як правіла, асновы іх прафесійнай падрыхтоўкі, агульна-эстэтычны ўзровень, матывацыя выбару будучай прафесіі фарміруюцца да паступлення ва УВА і ССНУ. У гэтым заслуга сучасных школ мастацтваў, нават агульнаадукацыйных школ, якія даюць базавую, але дастаткова грунтоўную падрыхтоўку. У працэсе далейшага навучання гэты ўзровень не толькі павышаецца, але і набывае кірункі, адпаведныя абраным спецыяльнасцям і спецыялізацыям. Трэба ўлічваць і тую акалічнасць, што музейныя практыкі ва УВА і ССНУ, як правіла, праходзяць на апошніх курсах.

Больш складаным з'яўляецца пытанне аб узаемасувязі месца правядзення музейных практык з улікам профілю музеяў (гісторыка-краязнаўчы, мастацкі, гісторыка-этнаграфічны, комплексны і інш.) і зместам спецыяльнай падрыхтоўкі. Практычна ўсе УВА ў Беларусі знаходзяцца ў Мінску, абласных цэнтрах або буйных гарадах, дзе ёсць музеі. Некалькі іншая сітуацыя склалася з ССНУ, значная частка якіх працуе ў гарадах раённага падпарадкавання і мае падрыхтоўку па творчых спецыяльнасцях. У сувязі з гэтым не кожная навучальная ўстанова можа паўнавартасна арганізаваць музейную практыку непасрэдна ў месцы свайго знаходжання.

Музей старажытнабеларускай культуры Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі па складзе фондаў можна класіфікаваць як комплексны. Тут захоўваюцца буйныя калекцыі іканапісу, скульптуры, народнага касцюма і традыцыйнага тэкстылю, народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, помнікаў этнаграфіі, мастацкага і побытавага шкла, керамікі, археалогіі і інш. Невыпадкова зборы музея, вопыт навуковых супрацоўнікаў шырока запатрабаваны УВА і ССНУ для правядзення экскурсій і вучэбных практык. На працягу апошняга часу ў музеі праходзілі заняткі са студэнтамі мастацкіх спецыяльнасцей Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава, Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, Мінскага архітэктурна-будаўнічага каледжа.

Аднак найбольш паказальны вопыт па выкарыстанні і запатрабаванасці патэнцыялу музея ў вучэбнай і адукацыйнай працы склаўся ў супрацоўніцтве з дзвюма сталічнымі УВА – Беларускім дзяржаўным універсітэтам культуры і мастацтваў і Беларускай дзяржаўнай акадэміяй мастацтваў. Правядзенне практык (вытворчых, пераддыпломных) са студэнтамі гэтых навучальных устаноў праходзяць у музеі ў адпаведнасці з вучэбнымі планамі па спецыяльнасцях: Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў – «дэкаратыўна-прыкладное мастацтва» (рэстаўрацыя вырабаў), «мастацтвазнаўства», «народная творчасць» (народныя рамёствы), «музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны»; Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў – «манументальна-дэкаратыўнае мастацтва» (рэстаўрацыя), «мастацтвазнаўства», «дызайн» (аб'ёмны, побытавых рэчаў, прадметна-прасторавага асяроддзя, інтэр'ераў, графічны), «дэкаратыўна-прыкладное мастацтва» (вырабы з керамікі, металу, тэкстылю; касцюм).

Для паспяховага правядзення практык, дасягнення неабходнага выніку важнае значэнне маюць доўгатэрміновыя кантакты з навучальнымі ўстановамі, замацаваныя дагаворамі, пагадненнямі (з УВА, факультэтамі, выпускаючымі кафедрамі). У адпаведнасці з імі вызначаюцца кіраўнікі практык – не толькі з накіроўваючага боку, але і з боку музея. Як правіла, гэта вопытныя спецыялісты, захавальнікі калекцый. Важную ролю

для арганізацыі працы і студэнтаў, і кіраўнікоў выконваюць установачныя сесіі, якія праводзяцца непасрэдна ў музеі. Падчас іх студэнты знаёмяцца з кіраўнікамі, умовамі і месцам сваёй будучай працы ў статусе практыкантаў. Гэта дазваляе наладзіць пэўныя псіхалагічныя кантакты, якія садзейнічаюць максімальнай выніковасці практык.

Прастора, культура музея асабліва актуальныя, калі размова ідзе аб фарміраванні падчас практык прафесійных кампетэнцый студэнтаў творчых спецыяльнасцей. У дадзеным выпадку разуменне і трактоўка такіх кампетэнцый непарыўна звязана з выхаваннем важнейшых якасцей асобы музейнымі сродкамі, якія ўключаюць развіццё маральнай культуры, гістарычнай і нацыянальнай самасвядомасці, мастацка-эстэтычных норм і ідэалаў і накіраваны на фарміраванне духоўнага станаўлення творцаў, іх адказных адносін да сваёй місіі. Выкарыстанне музейнага патэнцыялу ў адукацыйным працэсе спрыяе выхаванню псіхалагічнай і маральнай гатоўнасці чалавека быць суб’ектам культурных пераўтварэнняў, якія адбываюцца ў грамадстве [3, с. 11–13].

Музейныя экспазіцыі і фонды не заўсёды аказваюцца набліжанымі да ўмоў адукацыйнага працэсу. У дадзеным выпадку асаблівую актуальнасць набываюць так званыя віртуальныя музеі. У ліку іх бясспрэчных пераваг магчымасць атрымліваць неабходныя веды і шырокі спектр інфармацыі з выкарыстаннем інавацыйных методык і інтэрнэт-тэхналогій (базы даных, музейныя электронныя экспанаты, лічбавыя фота-, аўдыя-, відэаматэрыялы і інш.) у любы час з любой музейнай ці галерэйнай установы [2, с. 5–6].

Такім чынам, можна канстатаваць, што музейныя практыкі займаюць важнае месца ў сістэме фарміравання прафесійных кампетэнцый будучых спецыялістаў творчых спецыяльнасцей. З’яўляючыся відам вучэбных заняткаў, яны накіраваны на замацаванне ведаў, атрыманых на тэарэтычных курсах, на занятках у аўдыторыях і майстэрнях [4, с. 10–11]. Непасрэдны кантакт з помнікамі культуры і мастацтва адкрывае шырокія магчымасці для самаадукацыі, эмацыянальнага развіцця асобы, садзейнічае назапашванню ведаў у галіне гісторыі мастацтва, абагачае творчае мысленне.

1. *Бакиева, Д. А.* Концепция открытого образования: взаимодействие системы образования и музея / Д. А. Бакиева // Международный научно-исследовательский журнал. – 2014. – № 12-2 (90). – С. 83–86.

2. *Лебедев, А. В.* Виртуальные музеи и виртуализация музея / А. В. Лебедев // Мир музея. – 2010. – № 10. – С. 5–9.

3. *Субботина, О. В.* Формирование культурного опыта студентов в музейной образовательной среде : автореф. дис. ... канд. пед. наук : 13.00.02 / О. В. Субботина ; Костромской гос. ун-т им. Н. А. Некрасова. – Кострома, 2006. – 21 с.

4. *Сысоева, И. А.* Музейная практика: методические рекомендации / И. А. Сысоева, Т. П. Уласевич. – Витебск : ВГУ им. П. М. Машерова, 2017. – 20 с.

УДК 005.44+004.77:304.44–057.875

***Д. В. Лебедева,***
*старший преподаватель кафедры белорусской и зарубежной филологии учреждения образования «Белорусский государственный университет культуры и искусств»*

## ПРОБЛЕМЫ ФОРМИРОВАНИЯ КУЛЬТУРНОЙ ИДЕНТИЧНОСТИ СТУДЕНТОВ В УСЛОВИЯХ ГЛОБАЛИЗАЦИИ

**Аннотация**. В статье рассматриваются проблемы влияния социальных сетей на формирование самосознания студенческой молодежи.

**Ключевые слова:** культурная идентичность, глобализация, Интернет, социальные сети, контент, шаблоны восприятия, педагогическое воздействие.

***D. Lebedeva,***
*Senior Lecturer of the Department of Belarusian and Foreign Philology of the Educational Institution "Belarusian State University of Culture and Arts"*

## PROBLEMS OF FORMING CULTURAL IDENTITY OF STUDENTS IN GLOBALIZATION

**Abstract.** This article deals with influence of social media on the formation of students'self-awareness.

**Keywords:** cultural identity, globalization, Internet, social media, content, patterns of perception, pedagogical influence.